Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

17 ЧЭРВЕНЯ 2016 г. ПЯТНІЦА № 114 (28224) Кошт 2400 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА




**Патрабуйце чэк у таксіста**

СТАР. 2



**Затопленыя карціны**

СТАР. 12



**Праграма тэлебачання на тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**



Праект

# АСНОЎНЫЯ ПАЛАЖЭННІ ПРАГРАМЫ САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАГА РАЗВІЦЦЯ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ на 2016—2020 гады,

## якая будзе прынята пасля шырокага грамадскага абмеркавання на пятым Усебеларускім народным сходзе

### ВЫНІКІ ПЯЦІГОДКІ. НАШЫ ДАСЯГНЕННІ

Галоўны вынік чацвёртай пяцігодкі (2011—2015 гады) — захаванне палітычнай стабільнасці, устойлівасці эканомікі і сацыяльнай абароны насельніцтва.

Нягледзячы на крызіс, які ўзнік у краінах-суседках, мы не толькі прадухілілі абвал, але і забяспечылі станоўчы рост эканомікі за пяцігоддзе. Больш за тое, па шэрагу напрамкаў нам удалося дамагчыся значных вынікаў.

**Беларусь увайшла ў ТОП-50 краін свету з высокім узроўнем чалавечага развіцця.**

Згодна з Дакладам ПРААН аб чалавечым развіцці Рэспубліка Беларусь па індэксе чалавечага развіцця сярод 188 краін свету перамясцілася з 68-га месца ў 2000 годзе на 50-е месца ў 2015 годзе.

**Валавы ўнутраны прадукт** на душу насельніцтва па парытэце пакупніцкай здольнасці вырас з 15,4 тыс. долараў ЗША ў 2010 годзе да 17,7 тыс. долараў ЗША ў 2015 годзе.

**Павысіліся памеры сацыяльных гарантый і даходаў насельніцтва,** што дазволіла знізіць долю малазабяспечанага насельніцтва з 7,3 працэнта ў 2011 годзе да 5,1 працэнта ў 2015 годзе.

**Істотна палепшылася дэмаграфія.** З 2014 года ўпершыню за дваццаць гадоў колькасць жыхароў у Беларусі пачала расці, сціснуліся дэмаграфічныя нажніцы.

У 2015 годзе нарадзілася 119 тыс. дзяцей, што на 494 дзіцяці больш, чым у 2014 годзе. Больш за палову народжаных дзяцей (57,2 працэнта) — гэта другія, трэція і наступныя дзеці ў сем'ях.

**На сусветны ўзровень выйшла айчынная медыцына** па ўсіх без выключэння напрамках: кардыялогія, анкалогія, траўматалогія, нейрахірургія, акушэрства і гінекалогія, педыятрыя і транспланталогія.

Нашых урачоў цэняць па ўсім свеце. Экспарт паслуг у галіне аховы здароўя сёння ажыццяўляецца ў 124 краіны свету.

**Прадоўжылася масавае будаўніцтва даступнага жылля.** Забяспечанасць насельніцтва жыллём вырасла з 24,6 кв. метра ў 2010 годзе да 26,5 кв. метра на аднаго чалавека ў 2015 годзе.

**Праведзена маштабная мадэрнізацыя прамысловасці і сельскай гаспадаркі,** куды ўкладзена больш за 40 мільярдаў долараў.

Цалкам абноўлена галіна дрэваапрацоўкі. Асвоена серыйная зборачная вытворчасць легкавых аўтамабіляў. Выраблены самы буйны ў свеце кар'ерны самазвал грузападымальнасцю 450 тон. Пабудаваны завод па вытворчасці сучасных чыгуначных электрацягнікоў. Пачата будаўніцтва Беларускай АЭС.

СТАР. 3

# РАЗАМ — ЗА МОЦНУЮ І КВІТНЕЮЧУЮ БЕЛАРУСЬ!



Наталля КУЛЬЦЕНКА 17 гадоў узначальвае дзіцячы дом горада Віцебска. Яна — лаўрэат званняў «Чалавек года Віцебшчыны-2014» і «Жанчына года Беларусі-2014». На V Усебеларускім народным сходзе Наталля Уладзіміраўна будзе прадстаўляць родны горад. На гэтым здымку яна разам са сваімі выхаванцамі.

Фота БЕЛТА.

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Павел КАЛАУР, старшыня праўлення Нацыянальнага банка:**

*«Макраэканамічныя ўмовы для праведзення дэнамінацыі прымальныя. Мы ў стане забяспечыць да канца года разам з урадам мэтавы ўзровень па інфляцыі — гэта не больш за 12%. На наступны год плануем адназначную лічбу па інфляцыі — не больш за 9%. І ў праграме да 2020 года прагноз прадугледжвае ўзровень інфляцыі не больш за 5%. Такія дзеянні ўрада і Нацыянальнага банка будуць падтрымліваць пакупніцкую здольнасць нацыянальнай валюты, павялічваць да яе давер».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 17.06.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 20028,00 | ▼ |
| Еўра | 22569,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 304,10 | ▲ |
| Укр. грыўня | 804,82 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X